каў, неабходных для прафесійнай падрыхтоўкі, якія будуць замацоўвацца на практыцы. Так пабудаваная метадычная праца дазволіць надаць базавым ведам, уменням і навыкам сістэмны характар, пазбегнуць неапраўданых паўтораў у розных вучэбных курсах;

— павышэнне суб'ектыўнай значнасці тэарэтычнага кампанента ў падрыхтоўцы студэнта будзе лепш ажыццяўляцца, калі для кожнага студэнта па кожным відзе практыкі будзе ствараецца індывідуалізаваная праграма з улікам аб'ектыўнага ўзроўню падрыхтоўкі студэнта і яго пажаданняў;

— павышэнне якасці правядзення практык можа мець месца пры замацаванні за канкрэтнымі групамі выкладчыкаў таго ці іншага віду практыкі.

**В.М.Бігеза,**
**дацэнт Беларускага універсітэта культуры**

## ФАРМІРАВАННЕ ПРАФЕСІЙНАГА МАЙСТЭРСТВА БІБЛІЯТЭКАРАЎ, ЯКІЯ АБСЛУГОЎВАЮЦЬ ДЗЯЦЕЙ

Сучасныя патрабаванні да ўдасканалення падрыхтоўкі спецыялістаў культуры вышэйшай кваліфікацыі, павышэння ўзроўню іх прафесійнай гатоўнасці абумоўліваюць актуальнасць праблемы фарміравання прафесійнага майстэрства будучага бібліятэчнага работніка ў працэсе навучання ва універсітэце. Бібліятэчная адукацыя павінна адпавядаць патрабаванням бібліятэчнай справы, адлюстроўваць яе сучасны стан і перспектывы развіцця. Бібліятэчная практыка — састаўная частка вучэбнага працэсу, аснова бібліятэчнай адукацыі. Такім чынам, у наяўнасці цесная ўзаемасувязь паміж навучаннем і практыкай у падрыхтоўцы спецыялістаў, якія валодаюць сапраўды прафесійным майстэрствам. Паняцце "прафесійнае майстэрства" разглядаецца ў псіхолага-педагагічных даследаваннях шматгранна. Мне бліжэй думка тых наву-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

коўцаў, якія лічаць, што фарміраванне асноў прафесійнага майстэрства адбываецца ў працэсе навучання і ў час абавязковага вопыту практычнай дзейнасці (Н.В.Кузьміна, В.А.Сласцёнін, З.А.Рэшатава, А.Ц.Растуноў і інш.).

Каб дасягнуць высокіх вынікаў у падрыхтоўцы спецыялістаў для працы з дзецьмі, важнае значэнне набывае практычная накіраванасць навучання. Такое навучанне можна здзейсніць, дабіваючыся ў выкладанні кожнага спецыяльнага прадмета (у яго змесце і методыцы) цеснага ўзаемадзеяння тэорыі і практыкі, забеспячэння сувязі паміж усімі відамі заняткаў ва універсітэце і працай студэнтаў у бібліятэках. Мэтазгодна таксама звярнуць увагу на сувязь самастойнай працы студэнтаў з пэўнымі вытворчымі практычнымі заданнямі, якія паслядоўна будуць выкананы імі ў розных тыпах бібліятэк, абслугоўваючых дзяцей. Напрыклад, прафесійнае майстэрства будучага спецыяліста можа праявіцца ва ўменні ствараць бібліяграфічны прадукт у традыцыйным і аўтаматызаваным рэжыме ці пры стварэнні фрагментаў аўтарскіх праграм для сямейных чытанняў. Дапамагчы студэнтам хутчэй адаптавацца ў вытворчай сферы можа збіранне своеасаблівага банка даных існуючых і ўкаранёных інавацыйных формаў і метадаў бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэк.

Бібліятэка сёння — гэта канцэнтраванне нацыянальнай памяці, назапашанай стагоддзямі, сістэматызаваныя і падрыхтаваныя да выкарыстання веды. І калі адукацыйную дзейнасць бібліятэкі разглядаць у шырокім сацыяльным кантэксце, то слушна бачыць у ёй свайго роду індыкатар працэсаў, што адбываюцца ў адукацыі. Менавіта таму цеснае супрацоўніцтва выкладчыкаў ФБІС з бібліятэкарамі можа надаць новы імпульс у фарміраванні прафесійнага майстэрства будучых спецыялістаў. Гэтаму можа садзейнічаць, напрыклад, сумеснае стварэнне своеасаблівых цэнтраў інфармацыйнай падтрымкі адукацыі, актуалізацыя тэматыкі курсавых і дыпломных прац, якая павінна быць набліжана да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

патрэб пэўнай бібліятэкі. Студэнты-аўтары могуць стаць удзельнікамі ўкаранення сваіх даследаванняў.

Пэўныя ўмовы для фарміравання прафесійнага майстэрства бібліятэкара які працуюе з дзецьмі, стварае прафіляванае выкладанне такіх агульнанавуковых дысцыплін, як педагогіка, псіхалогія, літаратура. Менавіта ад гэтага ў значнай ступені залежаць веды, уменні і навыкі будучага спецыяліста па развіцці культуры чытання дзяцей, іх бібліяграфічнага інфармавання і ў першую чаргу аб новай літаратуры. Сённяшні паток літаратуры для дзяцей вельмі разнастайны, і даволі часта ў літаратуразнаўцаў існуюць супярэчлівыя погляды на сучасны літаратурны працэс і нават на літаратуру нядаўняга мінулага. Таму бібліёграф не заўсёды мае магчымасць абаперціся на навуковы пункт гледжання прафесіянала. І тут апорай яму становіцца "філалагічны метад", гэта значыць метад самастойнага аналізу літаратурных з'яў у спалучэнні з бібліяграфічным метадам (М.І.Давыдава). Неабходна падкрэсліць, што бібліятэкарам, якія будуць працаваць з дзецьмі, неабходна авалодаць таксама літаратурна-педагагічным аналізам твора. Менавіта ён адначасова прадугледжвае крытэрыі эстэтычных каштоўнасцей і актывізацыю розных сфер чытацкага ўяўлення, што з'яўляецца састаўной часткай будучай практычнай дзейнасці. У час вытворчай практыкі студэнты могуць правесці для старэйшых падлеткаў Дзень інфармацыі "Сучасны літаратурны працэс" або скласці бібліядайджэсты па пэўных тэмах і інш.

Акрамя таго, пры выкладанні спецыяльных дысцыплін, на нашу думку, неабходна акцэнтаваць увагу на псіхолага-педагагічнай сутнасці бібліятэчна-бібліяграфічнай работы з дзецьмі. Менавіта такі падыход будзе ў значнай ступені садзейнічаць камунікатыўнай кампетэнтнасці будучага спецыяліста.

З'яўляючыся не толькі бібліятэкарам, але і педагогам, ён павінен адчуваць духоўны патэнцыял асобы юнага чытача і ўсімі сваімі ведамі, уменнямі і навыкамі дапамагаць гэтаму.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Неабходна канстатаваць таксама, што сёння ёсць комплексныя накірункі, аднолькава важныя для развіцця сістэмы адукацыі і бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці. Сярод іх, напрыклад, папулярызацыя класічнай мастацкай і навукова-пазнавальнай літаратуры, якая дапамагае навучэнцам не толькі атрымаць разнастайныя веды, але і садзейнічае гуманізацыі асабы, развіццю творчых здольнасцей, выпрацоўцы і фарміраванню ўстойлівых пазнавальных інтарэсаў. Аднак школьная бібліятэка сёння яшчэ не адпавядае свайму прызначэнню. Менавіта таму спецыялізаваныя дзіцячыя публічныя бібліятэкі вымушаны выконваць складаныя "перабудовачныя" запыты дзяцей, звязаныя з вучобай. Больш таго, дзіцячая бібліятэка ў значнай ступені замяшчае школу ў такіх найважнейшых сферах, як навыкі працы з кнігай і інфармацыйная культура. Замест неабходнага супрацоўніцтва бібліятэкі і школы ў мэтах вырашэння задач, пастаўленых рэформай школы і Канцэпцыяй выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь, адчуваецца іх значная аддаленасць. У выпраўленне існуючай сітуацыі могуць унесці свой ўклад і студэнты-практыканты ФБІС. Працуючы ў розных бібліятэках, яны маюць магчымасць разам з бібліятэкарамі дзіцячых, школьных бібліятэк удзельнічаць у каардынацыі планаў работы, арганізацыі сумесных семінараў бібліятэкараў і настаўнікаў, у стварэнні розных электронных баз даных, адным словам, у пабудове своеасаблівых "школьна-бібліятэчных сістэм", у якіх трыядаю будзе школа — школьная бібліятэка — дзіцячая бібліятэка. Такое супрацоўніцтва дазволіць у значнай ступені падрыхтаваць дзяцей да ўспрымання інфармацыі на розных носьбітах, авалодвання навыкамі зносін на падставе невербальных формаў камунікацыі з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў.

Неабходна адзначыць таксама, што ў час вытворчай практыкі студэнты маюць магчымасць не толькі прымяніць пры абслугоўванні дзяцей набытыя веды, уменні і навыкі, але і адчуць парою іх недастатковасць. Выправіць такое

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

становішча можна, удасканальваючы арганізацыю вучэбнага працэсу на ФБІС. Як вядома, сёння дзіцячая бібліятэка перастала быць адзінай установай бібліятэчна-біблі-яграфічнага абслугоўвання дзяцей. У рэспубліцы існуе шмат публічных бібліятэк для дарослых, якія таксама займаюцца гэтай справай. Больш таго, вядучымі групамі ў шэрагу гэтых бібліятэк сталі чытачы дзіцячага і юнацкага ўзросту. А гэта, безумоўна, патрабуе ад бібліятэкара спецыяльных ведаў, уменняў, навыкаў. Між тым невялікая колькасць студэнтаў, якія складаюць спецыялізацыю "дзіцячыя і школьныя бібліятэкі", не забяспечвае нават спецыялізаваныя дзіцячыя бібліятэкі краіны. Вучэбныя ж планы іншых спецыялізацый, і ў першую чаргу спецыялізацыі "публічныя бібліятэкі" (22% выпускнікоў ФБІС трапляе ў публічныя бібліятэкі), не ўключаюць ніводнай дысцыпліны для падрыхтоўкі бібліятэкараў да працы з дзецьмі. Ці не таму да дзяцей трапляюць кнігі, якія не спрыяюць іх духоўнаму росту і ці не ў гэтым прычына няпоўнага задавальнення інфармацыйных патрэбнасцей навучэнцаў агульнаадукацыйных школ і асабліва ліцэяў, гімназій, каледжаў, якія працуюць па індывідуальных праграмах і арыгінальных методыках. На нашу думку, пры складанні чарговага вучэбнага плана спецыялізацый неабходна больш увагі ўдзяляць комплексу "Дзіцячая літаратура", увесці практыкум па курсе "Бібліяграфія літаратуры для дзяцей і юнацтва" і вельмі важны ва ўмовах нашай краіны курс "Бібліятэка ў сістэме экалагічнай адукацыі насельніцтва". На падставе вышэй-сказанага мы лічым, што вучэбны працэс і вытворчая практыка — беспераПынныя ў фарміраванні прафесійнага майстэрства бібліятэкараў, якія абслугоўваюць дзяцей. Яны разам рыхтуюць будучага спецыяліста, фарміруюць яго актыўную творчую і жыццёвую пазіцыю. І таму выкладчыкі спецыяльных дысцыплін павінны быць у пастаянным навуковым і метадычным пошуку супрацоўніцтва з бібліятэкамі розных краін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ